ДУА «ЕЛКАЎСКАЯ СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА»

# РЭХА ШКОЛЬНАГА ЖЫЦЦЯ

Агульнашкольная газета Верасень 2022 Выпуск №6

## У гэтым нумары:

Дзень ведаў 1

Агульнашкольны дзень здароўя 2

ШАГ "Гонар за Беларусь" 3

Урок прававых ведаў 4

## ДЗЕНЬ ВЕДАЎ



1 верасня 2022 года для 83 вучні нашай школы празвінеў першы званок, які абвясціў аб пачатку новага навучальнага года. Сёлета ў школу прыйшло 7 навучэнцаў - першакласнікаў, якім



прадстаўнікамі СВК "Сынковічы" ўручылі новыя школьныя партфелі. Прадстаўнік гаспадаркі пажадаў здароўя і плённай працы не толькі першакласнікам, але і ўсім вучням і настаўнікам школы. Святар Сынковіцкага



храма а. Віталій напомніў уісм аб духоўным жыцці школы і прыхода. А пасля празвінеў першы залівісты званок і ўсе разышліся па класах. Віншуем педагогаў, навучэнцаў і іх бацькоў з новым навучальным годам і жадаем поспехаў і моцнага здароўя!

Аўтар: Галонская М.

# АГУЛЬНАШКОЛЬНЫ ДЗЕНЬ ЗДАРОЎЯ

10 верасня ў школе прайшоў агульнашкольны дзень здароўя. У рамках якога для вучняў 1-3 класаў былі арганізованы "Рухомыя гульні", для 4-6 класаў - "Шкаліада", 7-11 – “Крос”.



Аўтар: Чак М.





## *«ГОНАР ЗА БЕЛАРУСЬ. АКТЫЎНАЕ ЛЕТА АКТЫЎНАГА ГРАМАДЗЯНІНА».*



22 верасня 2022 года ва ўстанове адукацыі падбыўся праект ШАГ па тэме "Гонар за Беларусь. Актыўнае лета актыўнага грамадзяніна". Госцем стала намеснік кіраўніка па ідэалагічнай і сацыяльнай працы СВК "Сынковічы" Дешка Вольга Міхайлаўна. Вольга Міхайлаўна расказала вучням аб індывідуальным працаўладкаванні ў СВК "Сынковічы", аб прапанаванай рабоце для непаўналетніх, аб тым як аформіцца на летняе працаўладкаванне, аб графіку працы. Таксама паведаміла аб аздараўленні для школьнікаў. Вольга Міхайлаўна акцэнтавала сваю ўвагу на тым, што СВК "Сынковічы" поўнасць аплачвае пуцёўкі ў ДАЛ "Блакітная хваля" і ДАЛ "Зяленая планета", якія знаходзіцца на базе Зэльвенскай санаторной школы-інтэрнат, і што для гэтага неабходна.



Аўтар: Салаўёва М.



# УРОК ПРАВАВЫЎ ВЕДАЎ



23 верасня ва ўстанове адукацыі прайшоў урок прававыў ведаў. Урок правяла начальнік аддзела ЗАГСа Зэльвенскага раёна Агей Алена Уладзіміраўна. Алена Уладзіміраўна паведаміла вучням об усіх іх правах, якія права дзеці маюць да 10 гадоў, да 14, і з 15 да 18 гадоў. Але, і самае галоўнае, у чарговы раз напомніла дзецям аб іх абавязках.

Аўтар: Цітоў П.



